**Г. К. Тычко,** *загадчык кафедры*
*беларускай філалогіі*
*і сусветнай літаратуры,*
*доктар філалагічных навук, прафесар*

# НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ НА ФАКУЛЬТЭЦЕ ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ

Беларуская літаратура – разам з іншымі дысцыплінамі педагагічнага і філалагічнага цыкла – уваходзіць у профіль падрыхтоўкі спецыяліста–выпускніка ўніверсітэта. Асноўныя мэты вывучэння яе – сфарміраваць сістэму ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для паспяховага ажыццяўлення практычнай дзейнасці па абранай спецыяльнасці. Змест літаратурнай адукацыі павінен складацца з чатырох асноўных кампанентаў: ведаў; уменняў і навыкаў; вопыту практычнай дзейнасці; сістэмы норм адносін да рэчаіснасці, да людзей, да сябе.

Першы кампанент (веды) фарміруецца шляхам засваення разнастайнага практычнага і тэарэтычнага матэрыялу (чытанне літаратурных тэкстаў і знаёмства з іх літаратуразнаўчай інтэрпрэтацыяй). Другі кампанент (уменні і навыкі) стварае базу для далейшай самаадукацыі студэнтаў. Праграма арыентуе студэнта на фарміраванне і развіццё ўменняў, звязаных з адборам, сістэматызацыяй крытычнага матэрыялу, аналітычных уменняў (аналіз твора (эпізода), сюжэта, кампазіцыі, мовы мастацкіх твораў розных родаў і жанраў, тэарэтыка-літаратурных паняццяў і інш.); сінтэзуючых уменняў (абагульняць, рабіць высновы, супастаўляць). Трэці кампанент – вопыт практычнай дзейнасці набываецца студэнтамі падчас праходжання вытворчай практыкі.

Кожная навука мае сваю структуру, якая залежыць ад асаблівасцей прадмета яе вывучэння. Структура выкладання беларускай літаратуры абумоўлена працэсам вывучэння літаратуры ў школе, які складаецца з наступных элементаў: мэта навучання – літаратура – настаўнік – вучань. Прызначэнне літаратуры як школьнага прадмета – фарміраваць у вучняў пры дапамозе настаўніка адпаведны аб'ём літаратурных ведаў, вобразна-эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці, развіваць навыкі эстэтычнага аналізу, выхоўваць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адным з паказчыкаў якаснай прафесійнай падрыхтоўкі спецыяліста ў сістэме вышэйшай адукацыі з’яўляецца ўзровень самастойнасці студэнта. Кампетэнтнасны падыход у падрыхтоўцы работніка культурнай сферы ахоплівае не толькі авалоданне пэўнымі ведамі, уменнямі і навыкамі, але і такімі катэгорыямі, як матывацыя, індывідуальныя псіхічныя здольнасці асобы, гатоўнасць ужываць на практыцы ўласны вопыт засваення літаратурных твораў. Кампетэнтнасць у сферы самастойнай дзейнасці забяспечваецца веданнем асноў навуковай арганізацыі працы: спосабаў пошуку новай інфармацыі, апрацоўкі і ўжывання на практыцы ў кантэксце сучасных інтэрактыўных сродкаў адукацыйных тэхналогій, з улікам планаў арганізацыі сумеснай дзейнасці суб’ектаў і ўзроўняў узаемадзеяння выкладчыка і студэнтаў пры арганізацыі іх самастойнай працы (СП).

Хацелася б адзначыць, што структура і змест самастойнай працы студэнтаў уяўляюць сабой рэгуляваную сістэму, заснаваную на ўзаемадзеянні выкладчыка са студэнтамі, накіраваную на развіццё здольнасці самастойна атрымліваць патрэбную інфармацыю. У дадзеным выпадку выкладчык арганізуе, стымулюе, кантралюе, карэкціруе, ацэньвае вучэбную дзейнасць студэнтаў. Пры гэтым гнуткасць кіравання навучаннем студэнтаў працаваць самастойна як аснове іх прафесійнай кампетэнтнасці здзяйсняецца праз дыдактычнае камунікатыўнае ўздзеянне выкладчыка (камунікацыю). (Падрабязней пра мадэлі кіруемай самастойнай працы: Н. Драздова, А. Лабанаў // Материалы Междунар. науч.-практ. конф., Мінск, 16–17 ноября 2006 г. / Белорус. гос. ун-т, ист. фак.).

Як вядома з педагагічных даследаванняў, кіраванне вучэбнай дзейнасцю студэнтаў – гэта ключ да дасягнення імі прафесійнага поспеху, а павышэнне эфектыўнасці самастойнай дзейнасці павінна ўключаць трохузроўневую структуру кіравання вучэбным узаемадзеяннем.

На першым узроўні (які назавём умоўна кіраваннем) адрозніваюць наступныя этапы ўзаемадзеяння суб’ектаў: 1 – этап традыцыйнага ўздзеяння (суб’ект-аб’ектныя адносіны) S>A; 2 – этап пераходнага ўздзеяння (суб'ект-аб'ект-суб’ектныя адносіны), калі выкладчык аказвае аптымальнае ўздзеянне на студэнта або групу студэнтаў (S>A(S1)).

Другі ўзровень – сукіраванне. У дадзеным выпадку таксама адрозніваюць два этапы ўзаемадзеяння: 1 – этап адказнага

ўздзеяння студэнта (суб’ект-аб’ектныя адносіны) S>A(S1) і 2 – этап узаемадзеяння (суб’ект-суб’ектныя адносіны) (A1)S-A(S1). Дасягненне двух этапаў другога ўзроўню кіравання ўзаемадзеяннем спалучаецца са здольнасцю студэнта аказваць зваротнае ўздзеянне – менавіта ўздзеянне, а не толькі рэакцыю ў форме зваротнай сувязі на ўздзеянне педагога (першы этап) – і здольнасцю зваротнае ўздзеянне прымаць (другі этап). На дадзеным узроўні выкладчык выступае ў ролі кансультанта студэнтаў.

Трэці ўзровень – самакіраванне. Студэнт уздзейнічае на самога сябе, на сваю дзейнасць. На дадзеным узроўні самастойнага выкарыстання студэнтамі набытых ведаў, уменняў і навыкаў выкладчык становіцца экспертам даследчай дзейнасці, бо карэкціруе, кантралюе, ацэньвае ступень самастойнасці студэнтаў.

На нашу думку, найбольш актуальнымі праблемамі арганізацыі СПС, якія патрабуюць даследавання, пры вывучэнні педагагічных дысцыплін з’яўляюцца наступныя: а) метады і прыёмы актывізацыі вучэбнай і навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў, стымулюючыя пазнавальную актыўнасць; б) выяўленне сфарміраванасці ўменняў самастойнай дзейнасці; в) вызначэнне гатоўнасці студэнтаў да творчага характару даследчай і педагагічнай дзейнасці і імкнення да самакіравання. Самастойнасць студэнтаў як аснова іх прафесійнай кампетэнтнасці фарміруецца ў працэсе кіравання вучэбнай дзейнасцю, вышэйшай формай якой з’яўляецца самастойная праца, заснаваная на двухпланавай структуры развіцця дзейнасці і ўзроўневай сістэме кіравання вучэбным узаемадзеяннем.

Формай арганізацыі і кантролю СП з’яўляюцца літаратурныя дзённікі, кантрольныя працы, гутарка на экзамене, падрыхтоўка да практычных заняткаў, а таксама напісанне творчых даследаванняў.

Такім чынам, мадэль узроўневага кіравання фарміраваннем самастойнасці студэнтаў-завочнікаў ва ўмовах ВНУ спрыяе павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў праз узмацненне пазнавальнай актыўнасці студэнта.

На сучасным этапе рэфармавання сістэмы вышэйшай адукацыі самастойная праца студэнтаў выступае ў якасці аднаго з асноўных кампанентаў вучэбнага працэсу, накіраванага на падрыхтоўку кампетэнтных спецыялістаў. Яе стратэгічнымі і тактычнымі мэтамі з’яўляецца дасягненне прамежкавых і канчатковых вынікаў у падрыхтоўцы выпускніка ВНУ: авалоданне і выкарыстанне ім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыяльна-прафесійных кампетэнцый (акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных).

Самастойная праца студэнтаў уключае наступныя ўзроўні: кантралюемую самастойную працу, кіруемую самастойную працу і непасрэдна самастойную працу студэнтаў.

Эфектыўная арганізацыя і ажыццяўленне кіруемай самастойнай працы студэнтаў немагчымы без наступных кампанентаў: нарматыўна-прававая база, вучэбна-метадычны комплекс, модульныя і рэйтынгавыя падсістэмы, інфармацыйныя тэхналогіі, сродкі і формы кантролю і інш.

Выяўленыя два планы развіцця самастойнай дзейнасці студэнтаў (кіруемая выкладчыкам самастойная праца → непасрэдна самастойная праца) з’яўляюцца асновай фарміравання вучэбнай самастойнасці з пазіцыі асобасна-дзейнаснага падыходу.

Пры распрацоўцы відаў і форм самастойнай працы мэтазгодна ўлічваць мадэль узроўневага кіравання, інварыянтныя кампаненты якой прадстаўлены ўзроўнямі ўзаемадзеяння суб'ектаў (кіраванне → сукіраванне → самакіраванне), а таксама паслядоўна павялічваць аб’ём самастойнай працы па меры авалодання студэнтамі навыкамі самаадукацыі, пашыраць формы самастойнай працы, паслядоўна пераходзячы ад простых да больш складаных, і павышаць іх творчы характар, актыўна ўключаючы элементы абагульнення практычнага вопыту, навуковага даследавання.

Асноўнымі фактарамі, якія ўплываюць на якасць самастойнай працы студэнтаў у ВНУ, становяцца: 1) майстэрства выкладчыка; 2) педагагічныя ўмовы эфектыўнасці самастойнай працы (сістэмнасць, этапнасць, рэйтынгавы кантроль); 3) сродкі метадычнага забеспячэння; 4) псіхалагічныя ўмовы прадуктыўнасці развіцця асобы; 5) метады актыўнага навучання і прыёмы самастойнай працы з друкаванымі крыніцамі інфармацыі.

1. *Бабко, Г. И.* Управляемая самостоятельная работа студентов : теория и практика / Г. И. Бабко // Организация самостоятельной работы студентов на факультете вуза : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 16–17 ноября 2006 г. / Белорус. гос. ун-т, ист. фак. – Минск, 2006.

2. *Коптева, С. И.* Инновационные технологии и психологическое сопровождение образования : ИТиПС-образование / С. И. Коптева, А. П. Лобанов, Н. В. Дроздова. – Минск, 2004.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ